Прага, 13 лістапада 2020 г.

Шаноўны спадар Віктар Бабарыка!

Сардэчна Вас вітаю і хачу Вас запэўніць, што я падтрымліваю Вас і ад душы зычу Беларусі і беларускаму народу як найхутчэйшага прыходу свабоды і дэмакратыі.

Я перакананы, што нам не можа быць абыякава, што адбываецца вакол нас. Вацлаў Гавэл напісаў, што абыякавасць да лёсу цэлага ёсць якраз тым, што адчыняе дзверы злу.

Шаноўны спадар Бабарыка, ліст, які я Вам пішу, сімвалічны, адкрыты, перадусім гэта ліст падтрымкі. Са значна большай уцехай я б даслаў яго Вам так, каб ён трапіў непасрэдна ў Вашы рукі або я б Вам з радасцю проста патэлефанаваў і падбадзёрыў Вас. На жаль, гэта немагчыма. Нягледзячы на тое, што я ўсяляк спрабаваў з Вамі скантактавацца, вынікам было паведамленне, што даслаць ліст Вам у рукі або патэлефанаваць Вам немагчыма.

Прызнаюся, што мяне гэта не здзівіла. Вы палітычны вязень, і я добра ведаю, што гэта за сабой цягне. У нас у Чэхіі таксама былі палітычныя вязні. Некаторых камуністы пакаралі смерцю, некаторых катавалі, некаторых саслалі на прымусовыя працы, а некаторых, якіх зламілі ці якім падарвалі здароўе, адпусцілі.

Таму я пра Вас і пра Беларусь 17 лістапада – у дзень, калі мы здабылі свабоду і пачалі ствараць дэмакратычную сістэму – інтэнсіўна думаю. Думаю пра тое, што ў Вашай краіне ўладарыць чалавек, якога называюць апошнім дыктатарам у Еўропе. Гэты чалавек дзеля ўтрымання сваёй улады не грэбуе скарыстацца якімі-колечы сродкамі, у тым ліку сфабрыкаванымі абвінавачаннямі і зняволеннем магчымых супернікаў, што напаткала і Вас. Нягледзячы на ўсе яго стаpанні, у сёлетніх жнівеньскіх выбарах ён відавочна прайграў. Аднак ніводны дыктатар ад улады добраахвотна не адмовіцца, бо не здольны разважаць як дэмакратычны палітык і баіцца таго, што з ім маглі б абысціся так, як ён абыходзіцца са сваімі апанентамі.

Калі ласка, ведайце, што таталітарная ўлада, якую падтрымлівае рэпрэсіўны апарат, не здольная вытрымаць настойлівы ціск усіх слаёў грамадства пры падтрымцы дэмакратычных краін усяго свету. Салідарнасць дэмакратычнай супольнасці – адна з асноўных перадумоваў паспяховай барацьбы з таталітарызмам, і мы да змагання беларускага народа за свабоду і дэмакратыю не можам быць абыякавымі.

Я цвёрда веру, што і дзякуючы ціску дэмакратычнай супольнасці Вы і астатнія вязні сумлення ў Беларусі будуць неўзабаве выпушчаны і што вы зможаце пазбыцца зла ў беларускім грамадстве.

Я ведаю, што нядаўна Вы адзначылі дзень нараджэння, таму Вам і Вашай краіне я дазволіў бы сабе пажадаць, каб пасля Вашага скорага вызвалення мы маглі б сказаць, што вы былі апошнімі вязнямі сумлення ў Беларусі.

З павагай

Мілаш Выстрчыл

## Мілаш Выстрчыл (нар. 1960)

старшыня Сената Парламента Чэшскай Рэспублікі



Вучыўся на фізічна-матэматычным факультэце Універсітэта Масарыка ў Брне, спецыяльнасць матэматыка. Затым выкладаў у гімназіі Отакара Бржэзіны, а з 2009 г. выкладае ў Вышэйшай школе палітэхнічнай у Іглаве. Палітычную кар'еру распачаў падчас Аксамітнай рэвалюцыі, калі сузаснаваў Грамадскі форум у горадзе Тэлч. У 1991 г. уступіў у новаўзніклую Грамадзянска-дэмакратычную партыю, у якой цяпер займае пасаду намесніка старшыні.

З 2010 г. працуе ў Сенаце Парламента Чэшскай Рэспублікі; у 2016-2020 гг. Быў старшынёй сенатарскага партыйнага клубу. У цяперашні час заступіў свайго папярэдніка Яраслава Кубэру і нягледзячы на супраціў астатніх найвышэйшых дзяржаўных прадстаўнікоў ажыццявіў візіт на Тайвань. Заканадаўчы двор парламента Тайваня ўганараваў Мілаша Выстрчыла медалём за парламенцкую дэмакратыю.

# Мілаш Выстрчыл

→

# Віктар Бабарыка



## Віктар Бабарыка (нар. 1963)

банкір і мецэнат.

З 2000 г. кіраваў Белгазпрамбанкам. Заснаваў некалькі дабрачынных фондаў (на падтрымку культуры, дапамогу дзецям і да т.п.). Стаўся бадай найпапулярнейшым кандыдатам на прэзідэнта і да выбараў дапушчаны не быў. У сфабрыкаваным працэсе разам са сваім сынам Эдуардам абвінавачваецца ў эканамічных злачынствах.